**Зіновій Кірылавіч Прыгодзіч (1944, Пінскі раён), пісьменнік, лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі (2013)**



Нарадзіўся ў в. Лышча Пінскага раёна ў сям'і патомных хлебаробаў. Пасля заканчэння Лышчанскай сярэдняй школы (1960) Зіновій Прыгодзіч супрацоўнічаў у Лагішынскай раённай газеце "Калгасная праўда" (1960—1962), працаваў карэспандэнтам-арганізатарам мясцовага радыёвяшчання. Пасля сканчэння факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта (1967) накіраваны на работу ў газету "Звязда" літсупрацоўнікам, пасля працаваў загадчыкам аддзела.

З 1977 года З.К.Прыгодзіч пачынае партыйную кар'еру, працуючы інструктарам аддзела культуры ЦК КПБ, памочнікам сакратара (1978—1981), у апараце ЦК КПБ. Работу ў партыйных органах спалучаў з вучобай у аспірантуры Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС (1981—1984) ў Маскве. Вынікам трохгадовай вучобы стала абарона кандыдацкай дысертацыі. Пасля працаваў у апараце ЦК КПБ, а з 1984 года — загадчык кафедры журналістыкі, мовы і літаратуры Мінскай ВПШ. Са студзеня 1989 года - намеснік загадчыка ідэалагічнага аддзела ЦК КПБ і рэдактар газеты "Советская Белоруссия", з 1992 года - галоўны рэдактар часопіса "Гаспадыня". У 1996—1999 гадах першы намеснік старшыні Дзяржкамдруку Беларусі. Адначасова з 2000 г. у Беларускім дзяржаўным ўніверсітэце.

Друкавацца пачаў у 1957 годзе. Першае апавяданне на рускай мове "Деньги" было апублікавана ў пінскай раённай газеце "Полесская правда" (1963). Спробы маладога журналіста ў жанры малой прозы прадвызначылі яго творчыя зацікаўленні. Піша на беларускай і рускай мовах вершы і апавяданні, нарысы, дакументальныя аповесці, навелы, лірычныя мініяцюры, крытычныя артыкулы, дзе аналізуюцца пытанні развіцця сучаснай беларускай літаратуры.

Творы пісьменніка-публіцыста, натуральна, вылучаюцца вастранадзённасцю праблематыкі: ён прысвячае іх працаўнікам вёскі, разважае аб праблемах сучаснай моладзі, захапляецца маральнымі якасцямі і багатай духоўнай культурай старэйшага пакалення. Гэтыя і іншыя тэмы пераважна сучаснага жыцця беларусаў знайшлі адлюстраванне ў наступных кнігах З. Прыгодзіча: "На палях рэспублікі" (публіцыстыка, 1968), "Добры дзень, сад!" (1974), "На сельских просторах" (1976), "Жменя зярнят" (1979) - нарысы і публіцыстыка, дакументальныя аповесці "Строгая доброта" (1976) і "Крылы дужэюць у палёце" (1977). У 80-ыя гады пісьменнік звярнуўся да мастацкай творчасці: ім былі напісаны аповесці "Журавы на далёкай пойме" (1984) і "Ноч перад нядзеляю" (1986), літаратурна-крытычная, даследчыцкая, публіцыстычная трылогія «Постаці» - журналісцкая трылогія пра сучаснікаў.

Пачатак ёй паклала аднайменная кніга ў 2011 годзе, што мела падзагаловак «З цэлым народам гутарку весці…». Надзіва запамінальныя атрымаліся партрэты Валерыя Анісенкі, Міхася Дрынеўскага, Марыі Захарэвіч, Леаніда Захлеўнага, Адама Мальдзіса, Івана Міско, сына Якуба Коласа Міхася Міцкевіча, Георгія Паплаўскага, Янкі Сіпакова, Анатоля Сульянава.

Праз тры гады выйшла другая кніга «Постацяў» з падзагалоўкам «Сэрца мільёнаў падслухаць біцця…» Як і ў першым выпадку, гэта не традыцыйныя дзесяць гутарак, калі той, хто бярэ інтэрв'ю, задае пэўныя пытанні, каб атрымаць на іх адказ, а менавіта дыялогі, якія, дзякуючы майстэрству З. Прыгодзіча, пашыраюць свае жанравыя межы. У выніку атрымаліся дыялогі-партрэты, дыялогі-нарысы, дыялогі-эсэ. Таксама было прадстаўлена дзесяць творцаў — гонар нацыі: Наталля Гайда, Валянціна Гаявая, Міхась Казінец, Леанід Левін, Міхаіл Савіцкі, Максім Лужанін, Алесь Савіцкі, Барыс Сачанка, Міхаіл Фінберг, Мікалай Яроменка.

Трэцяя кніга «Постацяў» пазначана 2016 годам. Падзагаловак яе «Гэткай шукаю цэлы век чэсці…» сведчыць, што чакаецца сустрэча з творцамі знакамітымі. Сапраўды, кніга атрымалася асветленая жыватворным святлом Генадзя Аўсяннікава, Генадзя Бураўкіна, Васіля Быкава, Аксаны Волкавай, Аляксея Дударава, Уладзіміра Ліпскага, Ігара Лучанка, Георгія Марчука, Мікалая Пінігіна, Леаніда Шчамялёва.

Дарэчы, да месца сказаць, што на творчасць З. Прыгодзіча-празаіка ў свой час звярнуў увагу народны пісьменнік Беларусі Янка Брыль, а Іван Антонавіч, цудоўны знаўца беларускай мовы, сам надзіва псіхалагічна глыбокі празаік, быў вельмі патрабавальны да слова, а таму строгі ў сваіх ацэнках. У гэтым пераконваешся, знаёмячыся з новым трохтомнікам З. Прыгодзіча. У кожнай кнігі свая назва: «Літаратура як лёс», «Як маланка, як хлеб», «Ці далёка чуваць?» Толькі падзагаловак паўсюль аднолькавы: «Пра літаратуру і літаратараў» (Мінск, «Деловая печать», 2019).

Акрамя прозы і публіцыстыкі, З.Прыгодзіч піша вершы, з якімі выступае ў перыядычным рэспубліканскім друку і калектыўных зборніках паэзіі. Апошнім часам ім апублікаваны нізкі вершаў у часопісах, паэма "Кукавала зязюля", а таксама выйшаў зборнік вершаў "Калі б не ты" (2002).

Беларускі вучоны, журналіст, пісьменнік, празаік. Член Саюза беларускіх пісьменнікаў Беларусі з 1986 года.

Кандыдат філасофскіх навук (1984), дацэнт. Заслужаны журналіст Беларусі (2002). Узнагароджаны медалём "За працоўную доблесць" (1981) і Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь (1995). Заслужаны журналіст БСЖ (2002).

У 2007 годзе Зіновій Прыгодзіч за тэматычны цыкл размоў з выдатнымі дзеячамі культуры стаў лаўрэатам конкурсу "Залатое пяро". У 2012 годзе за

творчыя партрэты дзеячаў беларускай літаратуры і культуры Зіновію Прыгодзічу быў ўручаны ганаровы знак-сімвал “Залаты Купідон” і дыплом Рэспубліканскага літаратурнага конкурсу “Лепшы твор 2011 года” ў намінацыі “Крытыка і літаратуразнаўства”.

Лаўрэат прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі 2013 года ў вобласці літаратуры, мастацтва, журналістыкі і аматарскай творчасці - за кнігу “Родник у лесных берез”.

## Творы З. К. Прыгодзіча

1. **Прыгодзіч, З. К.** Як маланка, як хлеб : пра літаратуру і літаратараў / Зіновій Прыгодзіч. - Мінск : Деловая печать, 2019. - 415 с.
2. **Прыгодзіч, З. К**. Літаратура як лёс : пра літаратуру і літаратараў / Зіновій Прыгодзіч. - Мінск : Деловая печать, 2018. - 351 с.
3. **Прыгодзіч, З. К.** Ці далёка чуваць? : пра літаратуру і літаратараў / Зіновій Прыгодзіч. - Мінск : Деловая печать, 2018. - 319 с.
4. **Прыгодзіч, З. К.** Постаці : гэткай шукаю цэлы век чэсці... / Зіновій Прыгодзіч. - Мінск : Беларус. Энцыкл. імя П. Броўкі, 2016. - 400 с. №4. С.169-178.
5. **Прыгодзіч, З. К.** Постаці: сэрца мільёнаў падслухаць біцця... / Зіновій Прыгодзіч ; [прадмова А. Карлюкевіча]. - Мінск : Звязда, 2014. - 317, [2] с.
6. **Пригодич, З.** Непостижимая и загадочная страна / Зиновий Пригодич // Нёман. 2011. № 7. С. 194-227.
7. **Прыгодзіч, З. К.** Постаці : з цэлым народам гутарку весці... / Зіновій Прыгодзіч ; [прадмова А. Карлюкевіча]. Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2011. 309, [2] с. : партр. Змест : пра В. Анісенку, М. Дрынеўскага, М. Захарэвіч, Л. Захлеўнага, А. Мальдзіса, І. Міско, М. Міцкевіча, Г. Паплаўскага, Я. Сіпакова, А. Сульянава.
8. **Пригодич, З. К.** Родник у лесных берез : повесть, эссе, рассказы, миниатюры, интервью : пер. с бел. / Зиновий Пригодич. – Минск : Четыре четверти, 2011. - 363 с. - (Библиотека Союза писателей Беларуси)
9. **Этой ночью**; “…Нестерпимо в ночной темноте” : [стихи] / Зиновий Пригодич // Белой Вежи свет : сб. поэзии Брестчины / сост. и пер. с бел. В.Гришковца. Мн. : Літаратура і Мастацтва, 2010. С.145.
10. **Прыгодзіч, З. К.** Вершы / Зіновій Прыгодзіч // Гаспадыня. 2010. №10. С. 34.
11. **Пригодич, З. К.** Путь полной луны : японский дневник / Зиновий Пригодич. — Минск : Деловая печать, 2009. — 236, [2] с., [16] л. цв. ил. — (Библиотека журнала "Гаспадыня").
12. **Регион.** Брестская область. Время действий и преобразований = The region. Region Brest. The time of actions and transformations: фотоальбом / [фото А. Г. Шаблюк и др. ; редактор-составитель З. К. Пригодич]. — Минск : Международный центр интеграционной информации.

Общественный пресс-центр Дома прессы, 2006. — 199 с. : цв. ил. — Текст параллельный на русском, английском языках.
13.**Мой вам совет**: проверено на себе! / сост. : З. Пригодич, С. Жиляк. — 2-е изд., перераб. и доп. — Минск : Деловая печать, 2006. — 255 с. — (Библиотека журнала "Гаспадыня").
14.**Прыгодзіч, З.** “На вейках сняжок растае…”: [вершы] / Зіновій Прыгодзіч // Маладосць. 2006. №3. С.126-128.
15.**Ой, гора-бяда** / словы Зіновія Прыгодзіча, музыка Алега Чыркуна // Гаспадыня. 2005. №4. С.37.
16.**Пригодич, З. К.** Крымская симфония : путевые заметки / Зиновий Пригодич. — Минск : Золотой улей, 2005. — 127 с., [16] л. цв. ил.
17.**Прыгодзіч, З. К.** Доўга будзе Карэя мне сніцца... : эсэ / Зіновій Прыгодзіч. — Мінск : Деловая печать, 2005. — 223 с. : каляр. фат. — (Библиотека журнала "Гаспадыня"). — Назва вокладкі : Долго будет Корея мне сниться... : эссе. — Аўт. паказаны на адвароце тыт. л. — Тэкст парал. бел., рус. — Загал. вокл. таксама рус.
18.**Прыгодзіч, З.** Гэтай ноччу ; Не прыедзе… ; Не дарую ніколі ; Вясна; Прызнанне ; Кардыяграма ; Уначы ; “Невыносна ў начной цішы”: [вершы] / Зіновій Прыгодзіч // Маладосць. 2004. №10. С. 12-14.
**19.Прыгодзіч, З.** Каб любіць Беларусь маю мілую… : старонкі дзённіка: пачуцці і роздум / Зіновій Прыгодзіч // Полымя. 2004. №10. С. 164-179.
20.**Прыгодзіч, З.** Сярод людзей. Старонкі дзённіка : пачуцці і роздум / Зіновій Прыгодзіч // Полесская правда. 2004. №147-153 (4 декабря ; 8 декабря ; 11 декабря ; 15 декабря ; 18 декабря).
21.**Мой вам совет** : Проверено на себе! / сост. : З. К. Пригодич, С. К. Жиляк. — Минск : Золотой улей, 2003. — 207 с. — (Бібліятэка "Гаспадыні").
22.**Прыгодзіч, З. К.** Калі б не ты : лірыка кахання / Зіновій Прыгодзіч ; [маст. Г. Грак]. — Мінск: ГА БТ "Кніга", 2002. — 229 с.
23.**Прыгодзіч, З. К.** Журба мая светлая : аповесці, апавяданні, лірыч. абразкі, мініяцюры / Зіновій Прыгодзіч ; [маст. Г.С.Грак]. — Мінск : Маст. літ., 2002. — 333, [2] с., [1] л.партр. : іл.
24.**Прыгодзіч, З. К.** Кукавала зязюля : паэма ў прозе / Зіновій Прыгодзіч // Маладосць. 2000. №4. С. 32-65.
25.**Гаспадыня**: Каляндар, 2001 / склад. : З. К. Прыгодзіч, С. К. Жыляк. — Минск: ОДО "Золотой улей", 2000. — 128 с. — (Бібліятэка часопіса "Гаспадыня"). — Ч. тэксту : рус.
26.**Гаспадыня**: Каляндар, 2000 / склад. : З. К. Прыгодзіч, С. К. Жыляк. — Минск: ИООО "Золотой улей", 1999. — 127, [1] с. — (Бібліятэка часопіса "Гаспадыня"). — Ч. тэксту : рус.
27.**Гаспадыня** : Каляндар, 1997 / склад. З.К.Прыгодзіч. — Минск : ИООО "Золотой улей", 1996. — 128 с. — (Бібліятэка часопіса "Гаспадыня"). — Тэкст : рус.
**28.Прыгодзіч, З.** Кукавала зязюля : урывак з паэмы ў прозе / Зіновій Прыгодзіч // Літаратура і мастацтва. 1999. 15 кастрычніка.

29.**Любимые мелодии** : сборник / сост. З.К.Пригодич. — Минск : ИООО "Золотой улей", 1999. Вып.3. — 159 с. — (Библиотека журнала "Гаспадыня"). — Содерж. : Циклы : Как прекрасен этот мир ; Любовь никогда не бывает без грусти ; У бацькоўскім кутку.
30.**Прыгодзіч,** З. Урыўкі з аповесці “Журавы на далёкай пойме” / Зіновій Прыгодзіч // Піншчына літаратурная : вершы, проза / рэдкал. М. І. Ляшук (гал. Рэд.) і інш. – Рэдакцыя газеты “Пінскі веснік”, 1999. - С. 86-87.
31.**Прыгодзіч, З. К.** Печаль моя светла : повести, миниатюры : пер. с белорус. / Зиновий Пригодич ; [худож. Е.Рудгайзер]. — Москва : Совет. писатель, 1990. – 384 с.
32. **Прыгодзіч, З. К.** Ноч перад нядзеляю: аповесць, лірычныя абразкі, мініяцюры / Зіновій Прыгодзіч ; [мастак Ф. І. Янушкевіч]. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1986. — 237, [1] с. : іл.
33.**Прыгодзіч, З. К.** Журавы на далекай пойме: аповесць : [для сярэд. і ст. шк. узросту] / [маст.У. М. Жук]. — Мінск : Юнацтва, 1984. — 236 с. : іл.
34.**Прыгодзіч, З. К.** Жменя зярнят : нарысы / Зіновій Прыгодзіч. — Мінск : Ураджай, 1979. — 189, [2] с. : іл.
35.**Прыгодзіч, З. К.** Воспитатель детского сада / З. К. Пригодич. — Минск : Народная асвета, 1978. — 16 с. — (Учащимся о профессиях).
36.**Прыгодзіч, З. К.** Крылы дужэюць у палёце : будні школьнага камітэта камсамола [скідальская сярэдняя школа № 3 Гродзенскай вобласці] / З. К. Прыгодзіч. — Мінск : Народная асвета, 1977. — 108, [2] с.
37.**Прыгодзіч, З. К.** Строгая дабрата : дакументальная аповесць [пра заслужанага настаўніка БССР, Героя Сацыялістычнай Працы П. І. Якімава] / Зіновій Прыгодзіч. — Мінск : Беларусь, 1976. — 95, [1] с. : іл. — (Людзі працоўнага і ратнага подзвігу)
**38.Прыгодзіч, З. К.** Добры дзень, сад! : пра вопыт работы дзіцячага сада № 219 г.Мінска / З. К. Прыгодзіч. — Мінск : Народная асвета, 1974. — 16 с.
39.**На палях Беларусі** = На полях Белоруссии / аўт. тэксту З.Прыгодзіч. — Мінск: Беларусь, 1968. — Тэкст парал. : бел., рус.
40.**Пригодич, З.** Непрерывная работа души : беседа с Георгием Марчуком / Зиновий Пригодич ; Ирина Кочеткова // Нёман. - 2016. — № 6. — С. 155-169
41.**Прыгодзіч, З.** Абраннік народнай песні : Міхасю Дрынеўскаму - 75! / Зіновій Прыгодзіч // Звязда. - 2016. — 20 лютага (№ 33).
42.**Прыгодзіч, З.** Генадзь Аўсяннікаў : "Свет выратуе духоўнае хараство" / Гутарку вёў Зіновій Прыгодзіч // Полымя. - 2016. — № 5.
43.**Прыгодзіч, З. К.** "Працуй сумленна штодня і поспех знойдзе цябе" : [гутарка з Георгіем Марчуком] / Зіновій Прыгодзіч // Белая Вежа. - 2014. — № 8.– С. 20–34.
44.**Прыгодзіч, З.** Над Вісліцай / Зіновій Прыгодзіч // Полымя. - 2019. — № 10. — С. 150 - 159.

45.**Прыгодзіч, З.** Ён любіў Беларусь нашу мілую : сустрэчы з Янка Сіпаковым / Зіновій Прыгодзіч // Полымя. - 2016. — № 1. — С. 163-169.
46. **Прыгодзіч, З.** Патрыярх беларускага мастацтва : Георгію Паплаўскаму - 85! / Гутарку вёў Зіновій Прыгодзіч // Звязда. - 2016. — 16 лютага (№ 29). — С. 8-9.
47.**Прыгодзіч, З.** "Харошкі" : палёт над часам : Дзяржаўнаму заслужанаму харэаграфічнаму ансамблю - сорак! / Зіновій Прыгодзіч // Рэспубліка. - 2014. — №44 (11 сакавіка). — С. 9.
48.**Прыгодзіч, З.** Храм талентаў : Сёння споўнілася б 80 гадоў Янку Сіпакову / Зіновій Прыгодзіч // Звязда. - 2016. — 15 студзеня (№ 7). — С. 13.
49.**Прыгодзіч, З.** "Шчасце – калі здзяйсняюцца мары..." / Гутарку вёў Зіновій Прыгодзіч // Звязда. - 2016. — 23 студзеня (№13). — С.10-11.
50.**Прыгодзіч, З.** Ад зімы да зімы : гісторыя аднаго кахання ў вершах, дзённікавых запісах і эсэмэсках / Зіновій Прыгодзіч // Полымя. - 2014. — № 10. — С. 56-75.
51.**Прыгодзіч, З.** Генадзь Аўсяннікаў : "Свет выратуе духоўнае хараство" / Гутарку вёў Зіновій Прыгодзіч // Полымя. - 2016. — № 5. — С. 145-161.
52.**Прыгодзіч, З.** К. Крыніцы Прыдзвіння / Зіновій Прыгодзіч // Полымя. - 2017. — № 7 — С. 139—155.
53.**Прыгодзіч, З.** К. Крыніцы Прыдзвіння : напачатку было слова / Зіновій Прыгодзіч // Полымя. - 2017. — № 8 — С. 165—173.
54.**Прыгодзіч, З.** Не дазваніўся ; Адкуль было знаць... ; Усё адносна ; Кардыяграма ; Прыстань журбы ; Бывае так... ; Канцэрт у Дамініканскім саборы ; Зноўку восень... : [вершы] / Зіновій Прыгодзіч // Літаратура і мастацтва. - 2014. — 17 кастрычніка (№41). — С.4.
55.**Прыгодзіч, З.** Патрыярх беларускага мастацтва : Георгію Паплаўскаму - 85! / Гутарку вёў Зіновій Прыгодзіч // Звязда. - 2016. — 16 лютага (№ 29). — С. 8-9 ББК 85.143
56.**Прыгодзіч, З.** Паэзія як прадчуванне / Зіновій Прыгодзіч // Звязда. - 16 кастрычніка (№ 197). — С. 7. - Мінск, 2019.
57.**Прыгодзіч, З.** Спелы жнівень Навума Гальпяровіча / Зіновій Прыгодзіч // Звязда. - 13 студзеня (№ 9). — С. 9.. - Минск, 2018 ББК П 81 ББК 83.3.
58.**Прыгодзіч, З.** Я кахаў, пакутаваў, гарэў! : [вершы] / Зіновій Прыгодзіч // Літаратура і мастацтва. - 2015. — 11 верасня (№ 36). — С.6.

59.**Аб жыцці і творчасці З.К.Прыгодзіча**

60.**Савік, Л. С.** Прыгодзіч Зіновій Кірылавіч / Л.С.Савік // Беларуская энцыклапедыя : у 18 т. / рэдкал. : Г.П.Пашкоў і інш. Мінск, 2001. Т. 13. С.60.
61.**Прыгодзіч** Зіновій Кірылавіч // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі : у 5 т. / С. Ф. Самбук ; рэдкал. : І. П. Шамякін (гал. рэд.) [і інш.]. Мінск, 1986. Т. 4. С. 395.

62. **Гарэлік, Л. М.** Прыгодзіч Зіновій Кірылавіч / Л. М. Гарэлік // Беларускія пісьменнікі : біябібліяграфічны слоўнік. У 6 т. / Ін-т імя Я. Купалы АН Рэспублікі Беларусь. Беларус. Энцыкл. ; пад рэд. А. В. Мальдзіса. Мінск, 1995. Т. 5. С. 62-63.
63. **Прыгодзіч** Зіновій Кірылавіч // На ладонях Припяти и Пины : литературный альманах Пинщины / авт.-сост. И. А. Кибак. Минск : ОДО “Тонпик”, 2004. С.137-138.
64. **Зіновій** Прыгодзіч (нар. у 1944 годзе) // Літаратурная карта Берасцейшчыны : краязнаўчыя нарысы, партрэты, артыкулы / укл. А. Крэйдзіч. Брэст : ААТ “Брэсцкая друкарня”, 2008. С. 462-464.
65. **Прыгодзіч** Зіновій Кірылавіч // Ученые Пинщины : [справ. издание] / авт.-сост. И. А. Кибак, П. Н. Синкевич, В. В. Василевицкий. Пинск : Пин. регион. тип., 2012. С.106.
66. **Гришковец, В.** Родник у лесных берез или Ночь заканчивается воскресением : [о книге З.Пригодича “Родник у лесных берез”] / Валерий Гришковец // Заря. 2013. 23 мая.
67. **Рудкоўская, І.** З цэлым народам гутарку весці : [аб кнізе З.Прыгодзіча “Постаці”] / Ірына Рудкоўская // Літаратура і мастацтва. 2013. №19 (17 мая). С. 5.
68. **Гришковец, В.** Нельзя человеку без веры : [о книге З.Пригодича “Родник у лесных берез”] / Валерий Гришковец // Полесская правда (Пинск). 2013. 26 января // Рэспубліка. 2013. 17 января.
69. **Ляшук, М.** “Родник у лесных берёз” : [книга З.Пригодича] / Мария Ляшук // Пінскі веснік. 2012. 21 снежня.
70. **Лешніца, К.** Асобы нацыянальнай культуры : [прэзентацыя кнігі З. Прыгодзіча “Постаці” у Нацыянальнай бібліятэцы Рэспублікі Беларусь] // Звязда. 2012. 17 сакавіка.
71. **Лазоўскі, С.** Айчыну сілкуюць асобы : [аб кнізе З. Прыгодзіча “Постаці”] / Сяргей Лазоўскі // Полымя. 2012. №1. С.176-178.
72. **Верціхоўская, М.** З цэлым народам гутарку весці / Марыя Вярціхоўская // Настаўніцкая газета. 2012. 16 лютага.
73. **Марціновіч, А.** Сэрца сэрцу голас падае : [аб кнізе З.Прыгодзіча “Постаці”] / Алесь Марціновіч // Рэспубліка. 2012. 19 студзеня.
74. **Без рэцэптаў** : [пра кнігу З. Прыгодзіча “Постаці : з цэлым народам гутарку весці”] // Звязда. 2012. 12 студзеня.
75. **Карлюкевіч, А.** Айчыну сілкуюць асобы : [аб творчасці Зіновія Прыгодзіча] / А. Карлюкевіч // Полесская правда (Пинск). 2012. 6 янв.
76. **Слуцкий, В.** [рец. на книгу З. Пригодича “Постаці”] / Василь Слуцкий // Неман. 2012. №1. С.223.
77. **“Творчество** и любовь – две великие тайны”: [интервью с З. К. Пригодичем] / беседу вела Валентина Поликанина // Беларуская думка. 2007. №3. С.144-151 // Гаспадыня. 2007. №4
78. **Елянеўскі, М.** Гаспадар “Гаспадыні” : [аб Зіновіі Прыгодзіче] / Мікалай Елянеўскі // Полесская правда (Пинск). 2004. 23 октября.

79. **Сіпакоў, Я.** Споведзь сына : [аб паэме З. Прыгодзіча “Кукавала зязюля”] / Янка Сіпакоў // Літаратура і мастацтва. 1999. 15 кастрычніка.
80. **Гук, У.** Святло палескіх зорак : [творчасць Зіновія Прыгодзіча] / Уладзімір Гук // Пинская неделя. 1999. 29 января.
81. **О назначении** З. К. Пригодича первым заместителем Председателя Государственного комитета Республики Беларусь по печати: Указ Президента Республики Беларусь от 24 июля 1996 г. № 274 // Собрание указов Президента и постановлений Кабинета Министров Республики Беларусь, 1996 г., № 21, ст. 518
82. **Об освобождении** З. К. Пригодича от должности первого заместителя председателя государственного комитета Республики Беларусь по печати : Указ Президента Республики Беларусь от 29 марта 1999 г. № 188 // Зарег. в Нац. реестре правовых актов Республики Беларусь, 1999 г., № 27, 1/219
83. **Зіновію** Прыгодзічу – 50 // Літаратура і мастацтва. 1994. 14 кастрычніка. С.12.
84. **Гришковец, В.** Главный герой – жизнь : [о прозе З.Пригодича] / Валерий Гришковец // Полесская правда (Пинск). 1991. 26 сентября.
85. **Зиновий** Кириллович Пригодич : [краткая биография] // Неман. 1990. № 2. С. 13.
86. **Зиновий** Пригодич : “Счастье – служить добру” : [интервью с писателем] // Полесская правда (Пинск). 1985. 13 ноября. (Встреча для вас).
87. **Пригодич, З.** Зиновий Пригодич : "Главное — не согрешить против Истины" : интервью / Зиновий Пригодич // Неман. - 2019. — № 11. — С. 151—164. ББК 83.3(4Беи)
88. **Берлеж, М.** Духоўнасць, маральнасць – першасныя : Зіновій Прыгодзіч / Мікола Берлеж // Звязда. - 2014. — 21 кастрычніка (№200). — С. 5.
89. **Гальпяровіч, Н.** Зіновій / Навум Гальпяровіч // Літаратура і мастацтва. - 2014. — 10 кастрычніка (№40). — С.12.
90. **Гузарэвіч, Л.** Натхнёны Палессем : нашаму земляку, літаратару Зіновію Прыгодзічу споўнілася 70 год / Людміла Гузарэвіч // Полесская правда. - 2014. — 1 ноября.
91. **Прыгодзіч, З.** Масты над Басфорам : дэлегацыя беларускіх пісьменнікаў правяла сустрэчы ў Стамбуле / Зіновій Прыгодзіч // Полымя. - 2013. — № 2. — С. 169-178.